УДК 821.161.3-2

***Н. В. Хаменка***

# ПОСТАЦІ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ Ў ТВОРАХ Л. ДАЙНЕКІ

*У артыкуле паказана адметнасць мастацкай інтэрпрэтацыі асоб беларускай гісторыі ў прозе Л. Дайнекі. Вызначана роля гістарычнай прозы аўтара для фарміравання грамадзянскай і патрыятычнай свядомасці грамадства.*

Напрыканцы XX – пачатку XXI стагоддзя ў беларускай літаратуры заканамерна ўзрасла цікавасць да айчыннай гісторыі. Постаці беларускай мінуўшчыны, яе поўныя драматызму і велічнасці моманты пачалі хваляваць не толькі спецыялістаў, але і шырокае кола грамадскасці. І на гэта ёсць прычыны. На крутых паваротах гісторыі людзі заўсёды звяртаюцца да дзён мінулых, каб больш дакладна і глыбока ўсвядоміць дзень сённяшні, каб зразумець свае вытокі, карані. Забыццё і пагарджэнне ўрокамі гісторыі спараджае непрадказальныя і недаравальныя памылкі і расчараванні. Гісторыя ўмее жорстка помсціць, але ж і ўмее вучыць тых, хто прагне гэтай навукі. “У падзеях мінулага, – сцвярджаў Караткевіч, – нашы карані. А дрэва без карэння не можа існаваць, ні тым больш прыносіць плады”.

Аднойчы надыходзіць перыяд жыццёвай сталасці і мудрасці, калі чалавек пачынае ўсведамляць важнасць свайго прыходу ў жыццё, задае пытанне сабе і іншым: хто мы і куды ідзём? Ён разумее, што, з аднаго боку,спалучаны са сваімі продкамі,а з другога – з нашчадкамі. Сапраўды, чалавек падобны да птушкі, якая лунае ў сучасным на двух крылах – будучыні і мінулага. І гэты жыццёвы палёт падараваны кожнаму дзеля памяці продкаў і будучыні нашчадкаў.

Веданне гістарычнага мінулага неабходна чалавеку дзеля ўсведамлення самога сябе, сваіх вытокаў і каранёў.Духоўным грунтам для грамадства з’яўляецца гісторыяРадзімы.

Многія айчынныя аўтары звярталіся да тэмы гістарычнага мінулага. У цэнтры іх твораў – як канкрэтна-гістарычныя асобы, так і выдуманыя.

Значнае месца сярод празаікаў, якія адлюстроўваюць у сваіх творах беларускую гісторыю,займае Леанід Дайнека. Як пісьменнік Л. Дайнека пачынаўся з лірыкі, хоць сярод ранніх публікацый у армейскай газеце “Красный боец” побач з вершамі былі таксама апавяданні і нарысы. Першымі яго кнігамі сталі паэтычныя зборнікі “Галасы” (1969), “Бераг чакання” (1972), “Начныя тэлеграммы” (1974). Сказанае ў іх маладым аўтарам выглядала больш важкім і цікавым, чым апублікаванае ў першым зборніку апавяданняў “Бацькава крыніца”(1976). Захапленне лірыкай не прайшло з гадамі маладосці: і ў сталага творцы, аўтара кніг прозы, жыве патрэбнасць у паэтычным слове. У 1980–1990-я гады выйшлі зборнікі

МГПУ им. И.П. Шамякина

вершаў і паэм (“Вечнае імгненне”, “Сняжынкі над агнём”), з’яўляліся падборкі ў перыядычным друку [1, 24].

Тэматычны абсяг лірыкі Л. Дайнекі дастаткова шырокі: вёска, горад, сучаснасць, мінулая вайна, біяграфія, далёкая гісторыя. Варта адзначыць, што ў Л. Дайнекі захапленне перамогамі і дасягненнямі “сям’і народаў”, неабсяжнай, “ад Брэста да Курылаў”, Радзімы было непадробным і шчырым.

Варта мець на ўвазе і тое, што сярод бязмежных прастораў вялікай радзімы, з якімі малады чалавек знаёміўся непасрэдна, не згубіліся Беларусь і радзінная вёсачка Змітраўка.

Думка пра свой народ, яго гістарычны лёс, сучаснае становішча выразна прачытваецца ў прозе Л. Дайнекі. Таіса Грамадчанка адзначае: “Раманная форма, да якой хутка звярнуўся пісьменнік, выводзіла на мастацкае асэнсаванне праблем гістарычнай памяці беларусаў” [1, 24].

Леанід Дайнека – адзін з тых пісьменнікаў, для каго беларуская гісторыя не прыгожыя і каларытныя малюнкі, а ключ да разумення жыцця сучаснай Беларусі. Яго раманы “След ваўкалака”, “Меч князя Вячкі”, “Жалезныя жалуды” адлюстроўваюць знакавыя, пераломныя моманты беларускай гісторыі.

Даследчыца В. Шынкарэнка слушна прапануе “з імем Л. Дайнекі... звязваць з’яўленне ў айчыннай літаратуры гістарычнага раманнага цыкла” [2, 479], хоць сам аўтар не рабіў спроб аб’яднаць у трылогію “Меч князя Вячкі”, “След ваўкалака” і “Жалезныя жалуды”.

Леанід Дайнека асвятляе ў гістарычных творах падзеі, якія маюць вялікае значэнне для нас, сучаснікаў. На прыкладзе вопыту мінулых пакаленняў ён даводзіць, што нельга вытрымаць цяжкія выпрабаванні і агульную небяспеку ў адзіночку. Пісьменнік напісаў свае раманы для таго, каб гісторыя паўстала ў нашых вачах не толькі ў выглядзе разбураных замкаў і старых камяніц, а ўяўлялася жывой, роднай, блізкай.

Гістарычная праблематыка сталася сэнсава значнай і магістральнай на празаічнай ніве Л. Дайнекі.

Раманы “След ваўкалака”, “Меч князя Вячкі” і “Жалезныя жалуды” складаюць гістарычную трылогію, у якой намаляваны асобы і падзеі нашага старажытнага мінулага. У цэнтры іх – вядомыя гістарычныя асобы Вячаслаў Барысавіч, Усяслаў Чарадзей, Рагнеда, Міндоўг і інш. Філасофскае асэнсаванне мінулага з пазіцый сучаснасці – адметнасць гістарычных твораў Л. Дайнекі.

Кампазіцыя рамана “Меч князя Вячкі” спрыяе выяўленню аўтарскай думкі, што лёс кіраўніка дзяржавы і лёс народа – адзін лёс. Першыя раздзелы рамана прысвячаюцца то паралельнаму паказу дзяцінства і

МГПУ им. И.П.Шамякина

юнацтва будучага князя паўночнага фарпоста Полацкага княства Кукейноса – Вячкі, то апісанню трагічнага лёсу Мірошкі ці шляху да волі Якава Палачаніна. Лёсы іх, як і ўмовы жыцця, зусім розныя, але потым жыццёвыя шляхі іх сходзяцца, і далей князь і воін не разлучаюцца да самай смерці. Пісьменнік паказвае князя Вячку як патрыёта роднай зямлі, багатую і свабодалюбівую натуру.

У цэнтры рамана “След ваўкалака” – вобраз славутага Усяслава Чарадзея, які, згодна з легендарнымі звесткамі, валодаў незвычайнымі здольнасцямі – разумеў галасы ўсяго жывога, мог перакінуцца ў ваўкалака. У рамане яскрава паказаны тагачасныя рэлігійныя супярэчнасці, якія вялі да процістаяння, непрымірымасці, гвалту. І гэтага не прымае князь Усяслаў, бо і “дзеці Перуна” і хрысціяне – людзі адной зямлі. У рамане Л. Дайнека ў асноўным засяроджваецца на незафіксаваных пісьмовымі крыніцамі падзеях жыцця князя ў зняволенні, шукаючы для ўвасаблення народжанай творчай фантазіяй задумы адпаведныя сродкі мастацкай паэтыкі.

Раман “Жалезныя жалуды” вяртае нас у часы зараджэння беларуска-літоўскай дзяржавы і таксама ўваскрашае гераіка-трагедыйныя старонкі змагання нашых продкаў з іншаземнымі захопнікамі.

Л. Дайнека стварыў свае гістарычныя раманы з думкай пра адраджэнне ў нашай душы і свядомасці гістарычнай памяці. Ён пайшоў шляхам вывучэння і мастацкага асэнсавання мінулага, каб паказаць нам, сваім сучаснікам, што мы з’яўляемся тым народам, які мае цікавае і самабытнае мінулае [3, 100].

Творы Л. Дайнекі дапамагаюць запоўніць прабелы ў нашых ведах пра беларускую гісторыю, асэнсаваць вопыт продкаў і ўгледзецца ў новае тысячагоддзе, адчуць гонар за мінулае, зведаць добрае, светлае пачуццё.

Заслуга Л. Дайнекі не толькі ў тым, што ён змог узнавіць духоўную атмасферу таго часу, стварыць уражлівыя, незвычайныя па сваёй эстэтычнай сіле вобразы старажытных беларусаў-ліцвінаў, але і напоўніў творы сучасным гучаннем, прымусіў нас задумацца над вечнымі каштоўнасцямі.

Літаратура

1. Грамадчанка, Т. “Хачу быць жытнім зернем я...”: да 70-годдзя Леаніда Дайнекі / Т. Грамадчанка // Роднае слова. – 2010. – № 1. – С. 24–27.

2. Шынкарэнка, В. К. Леанід Дайнека / В. К. Шынкарэнка // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. – Мінск, 2003. – Т. 4. Кн. 2. – С. 466–494.

3. Бельскі, А. І. Вандроўка па рацэ гісторыі / А. Т. Бельскі // Краса і смутак: літаратурна-крытычныя артыкулы. – Мінск, 2000. – С. 96–100.

МГПУ им. И.П. Шамякина